ных тэхналогій на розных этапах урока дапаможа зрабіць яго эфектыўным, выніковым, а працэс атрымання ведаў для вучняў – цікавым і прадуктыўным.

Такім чынам, толькі пералік некалькіх тыпаў тэхналоггій навучання і раскрыццё іх сутнасці дазваляе выявіць накірункі і спосабы арганізацыі навучальнай дзейнасці вучняў з мэтай развіцця іх самастойнасці, творчасці, цікавасці да авалодання новым матэрыялам, новымі ведамі.

**М.Р. ГАРБАЧЫК**
Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## ФАРМІРАВАННЕ МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНЫХ І ЭСТЭТЫЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Пытанні маральна-этычнага і эстэтычнага выхавання чалавека заўсёды хвалявалі грамадства. Асабліва гэта актуальна ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, калі назіраецца зніжэнне маральна-этычнай і эстэтычнай культуры. Таму задача фарміравання маральна-этычных і эстэтычных якасцей падрастаючага пакалення на сучасным этапе набывае вялікую актуальнасць. У XXI стагоддзі назіраюцца змены ў парадыгме навучання і выхавання, што абумоўлена тымі працэсамі, якія адбыліся і адбываюцца ў сучасным грамадстве. Перад сям’ёй, школай ставіцца задача падрыхтоўкі будучага члена грамадства з высокім узроўнем маральна-этычнай і эстэтычнай культуры. Літаратура – адзін з віда мастацтва, які ўздзейнічае на чытача маральна, этычна і эстэтычна. Развіццё маральна-этычнай і эстэтычнай культуры вучняў (фарміраванне іх маральна-этычных уяўленняў, маральнага аблічча, станаўленне каштоўнасных арыенціраў, фарміраванне густу і г.д.) уяўляе сабой працяглы і складаны працэс, які немагчыма ўявіць без удзелу ў ім літаратуры. Вялікую ролю ў гэтым займае дзейнасць настаўніка, яго ўзаемадзеянне з вучнямі малодшага школьнага ўзросту на ўроках літаратурнага чытання, паколькі менавіта гэты ўзрост характэрызуецца павышанай успрымальнасцю да засваення адпаведных правілаў, нормаў культуры паводзін. Вучань аналізуе сітуацыю, прачытаную ў той ці іншай кнізе, робіць пэўныя высновы аб учынках героя, пераносяць іх на сябе за кошт развіцця ўяўлення.

Звычайна ў педагагічнай літаратуры пытанні выхавання школьнікаў даследуюцца ў сувязі з пазакласнай і пазашкольнай працай, якая праводзіцца настаўнікам, патэнцыял урока выкарыстоўваецца недастаткова. Аднак відавочна, што фарміраванне не проста навыку чытання, а навыку выбарачнага чытання, роздуму і аналізу прачытанага тэксту, з’яўляецца больш прыярытэтнай задачай, так як гэта дазволіць сфарміраваць у вучняў маральна-этычныя і эстэтычныя якасці асобы, развівацца ім духоўна.

Можна вылучыць некалькі асноўных напрамкаў рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу ўрока літаратурнага чытання: а) выхаваўчы патэнцыял твора, які

будзе вывучацца; б) удасканаленне структуры ўрока; в) дэманстрацыйны матэрыял; г) арганізацыя зносін; д) прымяненне на ўроку сучасных педагагічных тэхналогій. У школьных падручніках "Літаратурнае чытанне" (II–IV кл.) сабраны лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў, якія спрыяюць фарміраванню ў вучняў добрага чытацкага густу. Пры рэалізацыі выхаваўчай функцыі на ўроку беларускага літаратурнага чытання важна, каб кожны структурны элемент урока нёс у сабе выхаваўчую нагрузку. Важным момантам у працэсе асэнсавання выхаваўчага значэння твора з'яўляецца праца з тэкстам. На ўсіх этапах урока, звязаных са знаёмствам з новым творам, праверкай першаснага ўспрымання і г.д., настаўніку важна навучыць вучняў убачыць выхаваўчы момант у творы, усвядоміць і пераняць тыя маральна і этычна правільныя ўчынкі, прыгажосць якіх хацеў указаць пісьменнік. Першае чытанне тэксту твора – складаны і шматгранны працэс, які прадугледжвае вырашэнне такіх пазнавальных і камунікатыўных задач, як разуменне, пошук канкрэтнай інфармацыі, самакантроль, аднаўленне шырокага кантэксту, інтэрпрэтацыя, каментаванне тэксту і мн. інш. У працэсе чытання ўдзельнічаюць такія механізмы, як успрыманне, пазнаванне, разуменне, асэнсаванне, рэфлексія і інш. Сфарміраванасць гэтых механізмаў дапаможа вучню больш дакладна і эфектыўна зразумець сэнс тэксту, убачыць выхаваўчы падтэкст.

Вялікую ролю ў арганізацыі працэсу асэнсавання твора, учынкаў яго герояў мае эмацыянальны фон і настрой вучняў, арганізацыя моманту суперажывання, паколькі ў спасціжэнні мастацкага тэксту асабліва важна выкарыстанне пачуццёвага і рацыянальнага уздзеяння, а эмацыянальныя перажыванні з'яўляюцца ўмовай успрымання маральных каштоўнасцей.

Сучасная школа павінна не толькі пазнаёміць з агульначалавечымі маральнымі каштоўнасцямі, але і арганізаваць пераходны працэс прыняцця іх і замацавання ва ўчынках вучняў. Маральныя каштоўнасці складаюць аснову сапраўдных твораў, вучань-чытач павінен іх вылучыць, перавесці на сваю мову і зрабіць сваімі.

Гэтую працу на ўроках літаратурнага чытання павінен арганізаваць настаўнік. Сутнасць гэтай працы заключаецца ў арганізацыі паўнацэннага ўспрымання вучнямі мастацкіх твораў, якія яны чытаюць на ўроках і дома. А самае галоўнае – неабходна, каб праца настаўніка была сістэмна арганізавана па двух кірунках: маральна этычным і эстэтычным. Каб успрыняць маральна-этычныя і эстэтычныя каштоўнасці, зрабіць іх сваімі, неабходна, каб на ўроках вучні: 1) думалі над пытаннем; 2) суперажывалі героям; 3) ацэньвалі іх учынкі; 4) асэнсоўвалі іх учынкі; 5) суадносілі іх жыццё са сваім; 6) імкнуліся рабіць учынкі ў адпаведнасці з успрынятымі маральнымі нормамі.

Асноўны змест маральнай культуры разглядаецца на маральна-тэарэтычным і эстэтычна-практычным узроўнях. Структура маральнай культуры ўключае ў сябе маральныя погляды, этычныя веды, жыццёвыя арыенціры і ідэалы, маральныя пачуцці, традыцыі, нормы, прынцыпы, запаветы, матывы, мэты, адносіны, учынкі, ацэнкі і інш. Сюды адносяцца маральныя катэгорыі (дабро і зло, свабода і залежнасць, альтруізм і эгаізм і да т.п.). З імі сэнсава звязаны маральныя якасці

асобы: міласэрнасць, добразычлівасць, сумленнасць, дабрыня, спагада, высакароднасць і сумленне – асабліва значныя кампанеты культуры маральных пачуццяў і перажыванняў. Выхаванне маральных пачуццяў школьнікаў – неад'емная ўмова іх маральнага развіцця. Асабліва важна выкарыстоўваць выхаваўчыя магчымасці літаратуры ў пачатковай школе (ІІ-ІV класы), бо менавіта ў малодшым школьным узросце вучні найбольш адгукаюцца на праблемы, якія закранаюцца ў творах,суперажываюць героям, асуджаюць ці радуюцца за іх, захапляюцца апісаннем прыроды ў творах. На прыкладзе канкрэтных твораў сродкамі мастацкага слова, праз мастацкія вобразы, аўтарскія погляды і перакананні адбываецца маральна-этычнае і эстэтычнае выхаванне вучняў малодшага школьнага ўзросту.

**Е.П. ГОНЧАРОВА**
Минск, БНТУ

## НЕГАТИВНЫЕ ЭМОЦИОНАЛЬНЫЕ СОСТОЯНИЯ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

Современное образование, находящееся в состоянии постоянной модернизации, требует многоаспектного изучения. Одним из актуальных факторов развития педагогической системы является ее эмоциональная составляющая и в частности негативные эмоциональные состояния.

Эмоциональный фон образовательного процесса прямо влияет на его результативность. Качество современного образования может быть обеспечено при условии своевременного снижения уровня таких негативных состояний, как агрессия и эмоциональное выгорание преподавателя, тревожность педагога и обучающегося.

Профессиональная деятельность педагога отличается высокой степенью эмоционального напряжения. Среди причин исследователями выделяются следующие:

1) нарушения дисциплинарного режима со стороны обучающихся;

2) асоциальное поведение обучающихся;

3) невыполнение обучающимися требований педагога;

4) конфликтные ситуации с коллегами;

5) стрессы, возникающие в ходе общения с родителями обучающихся;

6) высокий уровень ответственности за результаты своей педагогической деятельности;

7) межличностные отношения с руководителями учебного заведения и др.

Вышеперечисленные факторы могут стать стимулами для возникновения у преподавателя агрессивного состояния. В работах психологов подчеркивается, что агрессия является неотъемлемой частью биологической и психологической природы человека и выступает механизмом адаптации индивида к меняющимся и вариативным условиям среды (А. Адлер, А. Бандура, Л. Берковиц, С.Н. Ениколопов, Э. Фромм, И.А. Фурманов и др.).